***Кухарэнка В. М.***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт* (*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*)

# ФАРМІРАВАННЕ КУЛЬТУ ЛІДАРА ХАРВАЦКАЙ СЯЛЯНСКАЙ ПАРТЫІ СЦЯПАНА РАДЗІЧА І ЯГО РЭАЛІЗАЦЫЯ Ў МЕЖАХ ХАРВАЦКАЙ ПАЛІТЫКІ ПАМЯЦІ

У Харватыі адзін з братоў-заснавальнікаў і першы старшыня Харвацкай сялянскай партыі (ХСП) Сцяпан Радзіч стаў самым вядомым і папулярным харвацкім палітыкам яшчэ пры жыцці. Яго папулісцкія палітычныя тэзісы паўплывалі і на тое, што ён быў сапраўды любімым палітыкам харвацкага народу (у першую чаргу, сялянства). Ужо пры жыцці быў відавочны і яго станоўчы ўплыў на фармаванне харвацкай нацыі. Культ асобы, які з’явіўся яшчэ пры жыцці Радзіча (і ён нічога супраць свайго ўшанавання ў народзе не меў), пасля смерці палітыка сфармаваўся практычна адразу.

Трагічная смерць (Радзіч памёр 8 жніўня 1928 г. ад наступстваў замаху на яго жыццё пад час пасяджэння парламента Каралеўства СХС 20 чэрвеня), да якой мелі прамое дачыненне «вонкавыя» ворагі харвацкай нацыі – сербіянцы (мы выкарыстоўваем менавіта гэты тэрмін, бо носьбітам адмоўнай канатацыі для харватаў у міжваенны перыяд была менавіта гэтая частка сербскай нацыі), прывяла да ўзнікнення ў Радзіча яшчэ і іміджу пакутніка. Такім чынам, палітык стаў ідэальным «матэрыялам» для стварэння культу сучаснага нацыянальнага героя. Акрамя аб’ектыўных прычынаў, якія садзейнічалі гэтаму працэсу, неабходна памятаць і пра тое, што пасля смерці самага ўплывовага харвацкага палітыка яго асобай шмат хто хацеў скарыстацца для атрымання палітычных бонусаў.

Першаснай мэтай для паплечнікаў Радзіча быў пошук адэкватнай замены лідару ХСП, які здаўна карыстаўся статусам галоўнага гульца на прэчанскай арэне Каралеўства СХС. У кароткі перыяд паміж замахам на жыццё і смерцю Сцяпана Радзіча (20 чэрвеня – 8 жніўня) яго калегі не прымалі рашэнняў пра спадчынніка лідара партыі, больш за тое, паранены Радзіч працягваў прымаць рашэнні і партыйнага, і нават дзяржаўнага ўзроўню (напрыклад, адхіліў прапанову ўзначаліць урад, ці прапанову аб аддзяленні «вузкай» Харватыі) аж да крытычнага пагаршэння свайго стану 23–24 ліпеня [3, p. 241–242]. Толькі пасля яго ўваходжання ў стан комы стала зразумела, што наступствы замаху будуць вельмі цяжкімі не толькі для палітыка і яго сваякоў, але і для ХСП

і «прэчанскага фронту». Паплечнік Радзіча па Сялянска-дэмакратычнай кааліцыі Светазар Прыбічэвіч не быў папулярны ні сярод палітыкаў, ні сярод народа. Але, галоўнае, ён быў лідарам прэчанскіх сербаў, а таму ніяк не падыходзіў на ролю старшыні харвацкага нацыянальнага руху [6, str. 210].

Сярод бліжэйшых калег па партыі спадчыннікам у рэшце стаў Уладзімір (Ўладка) Мачак, палітык, які быў поўнай супрацьлегласцю Радзіча па тэмпераменту, характару, палітычнаму стылю – прасцей пералічыць адзінкавыя супадзенні, чым усе адрозненні паміж гэтымі лідарамі ХСП. 13 жніўня, на наступны дзень пасля пахавання Радзіча, клуб прадстаўнікоў ХСП вырашыў зацвердзіць Мачака на пасадзе лідара партыі. Але вычварнасць гэтага рашэння палягала ў тым, што Мачак станавіўся выконваючым абавязкі старшыні ХСП, а нябожчык «…Госпадам дадзены Правадыр харвацкага народу, пасля сваёй фізічнай смерці не перастае быць Народным Правадыром… і застаецца яе (партыі. – *В. К*) Старшынёй» [cit. prema: 4, str. 4].

Пахаванне Радзіча, якое сабрала рэкордную колькасць удзельнікаў жалобных мерапрыемстваў (па розных падліках ад 100 да 300 тыс. асобаў), суправаджалася сімвалічнымі праявамі. Напрыклад, на чале жалобнай працэсіі на падушцы ляжаў цярновы вянец, у цэнтры яго была змешчана куля, якой быў паранены Радзіч у Скупшчыне (югаслаўскі парламент). Сімвалічнымі ахоўнікамі гэтай падушкі былі Іван Пернар і Іван Гранджа, ахвяры таго ж замаху 20 чэрвеня, якія спрабавалі абараніць свайго лідара.

Кіраўніцтва ХСП намагалася ўмацаваць у народзе культ Сцяпана Радзіча. Рэгулярнае адзначэнне датаў, звязаных з жыццём народнага трыбуна (дзень нараджэння братоў Радзічаў – 11 ліпеня, дата замаху – 20 чэрвеня, дата смерці – 8 жніўня), было заслугай яго паплечнікаў па партыі. Яшчэ ў 1930-я гг. былі адкрыты некалькі помнікаў і бюстаў С. Радзіча.

Асноўным праектам па захаванню памяці была ідэя стварэння мемарыяльнага музея-маўзалея ў якім-небудзь знакавым месцы, напрыклад, у роднай вёсцы Радзічаў. Першая спроба арганізацыі невялічкага мемарыяла (па сутнасці, святыні Радзіча ў Сялянскім доме, куды знеслі вянкі з пахавання, кулю ды іншыя падобныя рэчы і ўпрыгожылі ўсё гэта вялікай колькасцю свечак) скончылася пажарам ужо 27 жніўня 1928 г. [5, str. 737].

Пасля першай няўдачы ідэя стварэння музею практычна знікае не толькі з-за супрацьдзеяння югаслаўскіх уладаў, але і зыходзячы са скла-

данай эканамічнай сітуацыі. Але галоўнымі экспанатамі плануемага музею павінны былі стаць забальзаміраваныя сэрца і мазгі Радзіча, якія не пахавалі разам з нябожчыкам. У лістападзе 1929 г. у выданні «Novosti» выйшаў ананімны артыкул пра знаходку ў сейфе пры ператрусе ў Сялянскім доме куфра, дзе змяшчаліся шклянкі з мазгамі і сэрцам былога лідара ХСП. Пра гэта паведамілі як сям'і нябожчыка, так і кіраўніцтву партыі. Справу хутка замялі (харвацкія выданні не жадалі кампраметаваць ні сям'ю, ні партыю, абмяркоўваючы гэтую далікатную сітуацыю), рэшткі забраў У. Мачак. Але праз два гады, у кастрычніку 1931 г. у Сялянскім доме зноў знайшлі замураваныя ў сцяну тыя ж пасудзіны. На гэты раз іх павінна была забраць дачка Радзіча, Міра Кашуціч. Падавалася, на гэтым блуканні рэшткаў харвацкага правадыра скончацца, але іх прыгоды толькі пачыналіся. Наступны раз іх знайшлі ўжо пасля вайны пры вызваленні скляпенняў былога Сялянскага дому (будынак быў перададзены пасля 1945 г. Сучаснай мастацкай галерэі). Рэшткі перадалі ў музей Інстытуту крыміналістыкі. Далей існуюць тры версіі іх лёсу. Першая (самая верагодная) – рэшткі зніклі пад час паводкі ў 1964 г. Другая версія, рамантычная, кажа пра тое, што ў музеі знайшоўся чалавек, сцяміўшы, каму належаць гэтыя забальзаміраваныя сэрца і мазгі. Ён перадаў рэшткі адданаму ідэалам ХСП святару, пасля чаго іх замуравалі ў алтар адной з заграбскіх цэркваў. Удзельнікі гэтай акцыі, як і любыя сведчанні пра месца, дзе нарэшце знайшлі супакой рэшткі харвацкага трыбуна, да гэтага часу невядомыя. Трэцяя версія пра пахаванне рэшткаў у магілу Радзіча не спраўдзілася пры рэстаўрацыйных працах на мемарыяле заграбскіх могілак Мірагой у 1996 г. [5, str. 735–736].

Альтэрнатыўным фронтам барацьбы за захаванне памяці палітыка выступіла сям'я Сцяпана Радзіча – Марыя Радзіч (удава), Уладзімір Радзіч (сын), Міра Кашуціч (дачка), яе муж і сакратар партыі Аўгуст Кашуціч. Акрамя рэгулярных дробных сутычак з колам У. Мачака, Радзічы канфліктавалі з кіраўніцтвам партыі з-за сваіх спробаў замены Сцяпана Радзіча яго сынам – Уладзімірам. Ад бацькі ён, на жаль, успрыняў толькі схільнасць да злоўжывання алкаголем і некаторыя вонкавыя рысы, ды зусім не меў схільнасцяў да палітычнай дзейнасці [1, str. 215]. Але Марыя Радзіч настойліва імкнулася параўнаць яго ў вачах харвацкага сялянства са сваім мужам і зрабіць з яго палітычнага спадчынніка Сцяпана Радзіча [2, str. 300].

І сям'я, і партыя займаліся яшчэ і распаўсюджаннем выяваў Радзіча не толькі на друкаванай прадукцыі і значках, але і на прадметах побыту

(абрусах, табакерках, гадзінніках, люстэрках, запакоўках мыла і іншых рэчах) ды нават на шакаладзе. Усё гэта, зразумела, не толькі садзейнічала распаўсюджанню культу, але і прыносіла прыбытак сваякам памерлага і ХСП.

Нягледзячы на ўсе праблемы, звязаныя з укараненнем культу Сцяпана Радзіча ў масах у міжваенны перыяд, у наш час можна ўпэўніцца ў нечаканай эфектыўнасці гэтых мерапрыемстваў. Памяць пра харвацкага народнага трыбуна зараз надзейна зацвердзілася менавіта на побытавым узроўні. У Харватыі, напэўна, у кожным населеным пункце ёсць вуліца ці плошча імя палітыка, ці прысвечаная абодвум братам Радзічам. Яго імем называюць грамадскія будынкі, арганізацыі, калектывы. Радзіч знаёмы кожнаму харвату і дзякуючы сваёй выяве на банкноце ў 200 харвацкіх кун. Пасля замаху на жыццё Радзіча і яго смерці яму была прысвечана песня «Kad je Stjepan Radić umirao», якая стала народнай. Зараз, праз 100 год, яе выконваюць не толькі фальклорныя і нават эстрадныя калектывы, але і звычайныя людзі пад час сямейных святаў. Нават у сацыяльнай сетцы Facebook ёсць група пад назвай «Dnevna doza Stjepana Radića» (назва пра дзённую дозу выклікана вядомым фактам, што Радзіч кожны дзень выпіваў 2 літры віна, але, хутчэй за ўсё, разбаўленага вадой, як гэта прынята ў Харватыі для заспакаення смагі). Яшчэ адным з нядаўніх прыкладаў захавання памяці пра лідара ХСП у моладзевым асяродку стаў студэнцкі фестываль яго імя, які курыруе студэнцкі дом (інтэрнат) «Сцяпан Радзіч» Заграбскага ўніверсітэту. Для гэтага фестывалю быў нават створаны гімн.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Arhiv Jugoslavije (AJ). Zbirka 37. Milan Stojadinović. Fasc. 10. Jed. op. 59.
2. AJ. Zbirka 37. Milan Stojadinović. Fasc. 19. Jed. op. 138.
3. *Biondich M.* Stjepan Radić, the Croat Peasant Party, and the politics of mass mobilization, 1904–1928. Toronto : University of Toronto Press, 2000. 344 p.
4. *Boban Lj.* Macek i politika Hrvatske seljacke stranke 1928–1941. Iz povijesti hrvatskog pitanja: u 2 knj. Zagreb : Globus, 1974. Knj. 1: Od 1928. do 1939. 483 str.
5. 5. Grgić, S. Radić nakon Radića: Stvaranje kulta heroja Stjepana Radića (1928.–1934.) / S. Grgić // Ćasopis za suvremenu povijest. 2010 – br. 3. Str. 723.–748.
6. *Matkovi H.* Svetozar Pribičević: ideolog, stranački vođa,. Zagreb : Hrvatska sveučilišna naklada, 1995. 356 str.